імкненне да самастойнасці і прафесійнай кампетэнтнасці. Для будучага бібліятэкара ці мэнеджэра культуры - гэта перш за ўсё ўменне аб'ектыўна ацаніць эстэтычныя вартасці мастацкага твора, звязаць яго з актуальнымі праблемамі культурнага жыцця грамадства, выхаваннем моладзі, стварэннем адпаведнай культурнай атмасферы ці асяроддзя і г.д.

Таму пры складанні плана-праспекта спецкурса неабходна ўлічваць некалькі істотных момантаў.

Па-першае, выбар праблематыкі, фармуліроўка і змест спецкурса па літаратуры павінны дакладна адпавядаць профілю спецыялізацыі, узроўню філалагічнай падрыхтаванасці, асабістым схільнасцям і інтарэсам студэнтаў. Без гэтага немагчыма ўявіць паспяховае супрацоўніцтва, творчы кантакт лектара і студэнцкай аўдыторыі, эфектыўнасць вучэбнай работы наогул.

Па-другое, спецкурс па літаратуры не павінен дубліраваць асобныя тэмы ці раздзелы агульнага курса. Калі гэта спецкурс па персаналіях ці па асобных вузлавых пытаннях пэўнага гісторыка-літаратурнага перыяду вучэбнай праграмы, ён павінен быць засяроджаны на пэўных тэарэтычных пытаннях, якія недастаткова асветлены ў агульным лекцыйным курсе. Звычайна гэта т.зв. скразныя тэмы ці праблемы, аб'яднаныя адзінствам пазнавальных і метадалагічных задач, скіраваных на паглыбленае вывучэнне спецыфікі літаратуры, яе жанраў, стыляў, функцыянальнай ролі на розных гістарычных этапах развіцця мастацкай літаратуры, мастацкага мыслення.

Па-трэцяе, план-праспект кожнага спецкурса павінен каардынавацца з сумежнымі кафедрамі. Гэта дазваляе пазбегнуць дубліравання, надаючы спецкурсу комплексны характар. Зразумела, што ў аснову праграмы спецкурса павінны быць пакладзены асабістыя навуковыя здабыткі, асабісты даследчы вопыт лектара, што само па сабе з'яўляецца незаменным стымулам для творчай працы студэнта. Удзел у навуковых канферэнцыях і семінарах - абавязковая ўмова паспяховага завяршэння семінара. Тэма семінара можа знайсці далейшы працяг у курсавых і дыпломных работах, рэспубліканскіх конкурсах і аглядах, у практычнай дзейнасці.

Вядома, што чытанне спецкурса па літаратуры павінна арганічна спалучацца з правядзеннем блізкіх да яго спецсемінараў. Менавіта на спецсемінарах практычна паглыбляюцца веды і практычныя навыкі, набытыя ў працэсе засваення спецкурса. Тут паралельна з даследаваннем мастацкіх твораў выпрацоўваюцца навыкі вусных ацэнак і выступленняў, уменні даць крытычны агляд літаратуры, весці навукова аргументаваную палеміку. Усё гэта ў комплексе значна паглыбіць філалагічную падрыхтаванасць студэнтаў, узброіць іх метадамі самастойнай навукова-даследчай і творчай працы.

**Гуліцкая В.А.,**
**дацэнт**

## КУЛЬТУРА МОВЫ ЯК АДЗІН З АСПЕКТАЎ АГУЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ СПЕЦЫЯЛІСТА

У наш складаны час, калі адбываецца адраджэнне нацыянальнай культуры, мяняецца наша мысленне, ідзе пераацэнка жыццёвых вартасцей, асаблівая ўвага павінна быць звернута на вышэйшую форму нацыянальнай культуры - беларускую літаратурную мову, бо ў нацыянальнай мове закладзена моцнае ўздзеянне на характар і псіхалогію чалавека. Прычым гэтае ўздзеянне вельмі канкрэтнае, таму што праз мову ўсё, створанае народам у мінулым, уся яго духоўная культура аказваюць уплыў на індывід. Вакуум, які стварыўся ў выніку адлучэння нацыі ад роднай мовы і культуры, прывёў да страты нацыянальнага імунітэту, да духойнай дэградацыі асобы. Сёння важна зразумець і адчуць неабходнасць выхавання адукаванага, культурнага, інтэлігентнага чалавека. Інтэлігентнасць - скарб чалавечай душы, вызначальная рыса духоўнасці, маральнасці. Нацыянальны інтэлігент пачынаецца з усведамлення свайго нацыянальнага «я». Адрадзіць нацыянальны статут інтэлігенцыі могуць толькі нацыянальная школа, нацыянальныя навучальныя вышэйшыя ўстановы, галоўнай умовай існавання якіх з'яўляюцца родная мова, гісторыя, культура. Недастатковае разуменне ролі мовы, культуры ўвогуле ў жыцці народа, нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці, кансерватыўнсць мыслення - самыя галоўныя перашкоды на шляху адраджэння.

Адраджэнне нацыянальнай свядомасці залежыць ад нашых адносін да ўсяго роднага. Да беларускай мовы ў сілу абставін, што гістарычна склаліся, павінны быць асаблівыя адносіны, бо ўсім відаць беларуская непісьменнасць: большасць студэнтаў універсітэта культуры, як і большасць насельніцтва, размаўляюць на «руска-беларускай трасянцы». Прычыны такога маўлення самыя разнастайныя: недастатковае засваенне арфаэпічных нормаў беларускай і рускай моў, уплыў арфаграфіі, звычайная недасведчанасць, а то, часам, і свядомае скажэнне унармаваных моўных з'яў, захаванне дыялектных асаблівасцей у мове студэнтаў, недастатковая лінгвістычная і метадычная падрыхтаванасць настаўнікаў.

У сферы моўнай дзейнасці, дзе патрабуецца высокая маўленчая культура (а гэта рэжысёры, сацыяльныя педагогі, бібліятэкары і інш.), парушэнне арфаэпічных нормаў недапушчальна. Трэба ўмець правільна і дакладна выказваць свае думкі, выбіраць найбольш прыдатнае, выразнае, вобразнае слова, найлепшы варыянт сінтаксічнай канструкцыі для канкрэтнага выказвання, умець карыстацца мовай ў розных жыццёвых сітуацыях з улікам задач і абставін моўных зносін. Набыць такое ўменне дапамагаюць заняткі па роднай мове, на якіх трэба даносіць да сэрца і розуму кожнага студэнта любоў да роднага слова, паказваць багацце нашай мовы, дапамагчы адчуць неабходнасць ведаць і ўжываць яе.

Перад выкладчыкам пастаўлена задача, у першую чаргу, клапаціцца пра фарміраванне ў студэнтаў нормаў вуснага маўлення, а г.зн. даць не толькі неабходныя тэарэтычныя звесткі па арфаэпіі, замацаваць у свядомасці патрэбныя маўленчыя навыкі і засцерагчы ад непатрэбных, а і садзейнічаць асабістай адказнасці за маўленчыя паводзіны, за стан маўленчай культуры навучэнцаў. Больш таго, неабходна выпрацаваць і развіць уменне карыстацца літаратурнай мовай усюды і заўсёды.

Сёння грамадства пачынае ўсведамляць, што без ведання роднай мовы, без упэўненасці ў тым, што яе будучыня гарантавана, немагчыма развіццё літаратуры, іншых відаў мастацкай культуры. Апрача таго, далучанасць усіх народаў да нацыянальнай мовы - гэта важны фактар палітычнай стабільнасці і маральнага здароўя грамадства.

Няфёдаў В.В.,
прафесар

## ПРОБЛЕМА ИЗУЧЕНИЯ ИСКУССТВА БУНИНА В СВЯЗИ С АВАНГАРДИСТСКИМ НАПРАВЛЕНИЕМ

В студенческой и педагогической среде ощущается острый интерес к проблеме «реализм и авангардизм». Так возникает актуальная учебно-методическая задача решения этой проблемы на конкретном, в частности историко-литературном материале, который требует к себе избирательного подхода. Здесь необходимо привлечение наиболее выразительного в эстетическом отношении творческого наследия.

В современном эстетическом мышлении (например, в «новой журналистике») делаются попытки обесценить художественный текст как отражение личности творца, занимающего определенную гражданскую позицию, представить писателя как чувствилище фактов, вырванных из социально-общественных связей. Таким образом, писатель лишается роли мыслителя, учителя жизни, борца за прогресс. Лучшие достоинства индивидульности большого мастера прошлого, например И.А.Бунина, служат примером для художника наших дней, долг которого состоит в том, чтобы создавать настоящие нравственно-эстетические ценности, помогать людям становиться чище, сильнее, укреплять фундаментальные основы их общественного бытия.

Реалистическое искусство Бунина- торжество изобразительности в условиях экспансии авангардизма, который отказывается от изучения объекта, в своих крайних проявлениях отталкивает живопись как форму познания бытия, делает вместо нее косную сущность, бездуховную материю (например, распад поэтического языка в экспериментах А.Крученых, его подача только языкового материала). Бунин своим искусством выступил против отказа от изобразительной традиции - от постижения мира, трезвого видения его, отказа, который наблюдал в авангардистской культуре и на Родине, и на Западе. Так, в 1913г. Б.Лифшиц в футуристической программной статье к сборнику «Дохлая луна» отрицал «всякую координацию... поэзии с миром».

В наше время в духовной сфере человеку навязывается авангардисткая тенденция иррационального. Например, сюрреализм или театр абсурда пронизаны истерической жаждой безумия, душевного хаоса, мистицизмом. Модернистскому искусству свойственен пафос отречения от разума ради иллюзий душевной свободы от стандартного буржуазного существования в ординарной среде капитализма.

Бунин-художник, оставаясь в границах личного творческого опыта, - союзник передового отряда мировой общественности. Неслучайно демократическая мысль пристально изучает его представления о реальности как ценные индивидуальные отображения исторических фактов. Бунин - убежденный гуманист. Он не представлял себя «вне изобразительного» искусства.

Адамовіч Я.К.,
дацэнт

## ЗБОРНІК ЯНКІ КУПАЛЫ «СПАДЧЫНА» Ў СВЯТЛЕ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

На грунце новых навеваў часу працэс навучання ў вышэйшай навучальнай установе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ